УДК 070
Д43

С.У. Дзядзінкіна

# Некаторыя аспекты журналісцкага пошуку ў рэгіянальных сродках масавай інфармацыі

Патрэба ў новай інфармацыі, новых эмоцыях, у камунікацыі, усталяванні дачыненняў з'яўляецца арганічнай патрэбай для сучаснага чалавека. Тым больш гэта актуальна для журналіста, які ў працэсе сістэмных і грамадскіх пераўтварэнняў вымушаны заставацца на пярэднем флангу імклівага жыцця. Прафесійная актыўнасць журналіста праяўляецца перш за ўсё ў няспынным журналісцкім пошуку новых тэм, фактаў, інфармацыі. У гісторыі станаўлення і развіцця журналістыкі вядома немала выпадкаў, якія сведчаць аб барацьбе рэпарцёраў за доступ да крыніц інфармацыі, за аператыўнасць яе перадачы. Хаця для сістэмы друку ў савецкія часы гэта было нетыповым. «У рэпартажах 30-х гадоў быў тыповы элемент гэткай экзотыкі, – сцвярджае Я. Засурскі. ...Многа расказвалася аб асвойванні Поўначы, аб папанінцах, Ота Шмідце, чалюскінцах, палётах Чкалава, авіяцыі. У гэтых рэпартажах майстэрства журналіста дапаўнялася незвычайнасцю сюжэта, што надавала ім дадатковую вастрыню» [1].

Сёння інфармацыйны свет рухаецца гіганцкімі крокамі наперад. Але новыя інфармацыйныя тэхналогіі паставілі ключавую праблему: паміж рознымі краінамі існуе велізарны разрыў у адносінах аб'ёмаў фінансавых, тэхнічных, матэрыяльных, прафесійных рэсурсаў, якія маюцца ў распараджэнні сродкаў масавай інфармацыі (СМІ). Асабліва востра не стае рэсурсаў краінам Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, падкрэсліваецца ў матэрыялах ЮНЕСКА [1, с. 176]. У ЗША ужо ў 1979 годзе ў інфармацыйнай індустрыі было занята больш 50% насельніцтва. У XXI стагоддзі на долю інфармацыі і ведаў будзе прыходзіцца больш 50% кошту усёй вытворанай прадукцыі. Аднак мы яшчэ не навучыліся разглядаць інфармацыю як прадукт. Між тым, у рэдакцыях газет развітых краін радыёстанцыі і радыёпрыемнікі настроены на хвалі паліцыі, хуткай дапамогі, вакзала, каб у патрэбны час тэрмінова быць на месцы падзеі.

Інфармацыйная прастора рэгіянальных СМІ ўяўляе сабой яшчэ незгарманізаваную мадэль постперабудовачнага грамадства. Яны не маюць выразнай стратэгіі з прычыны ўнутранай замкнёнасці, інэртнасці, прывычкі да залежнасці. Найвялікшы ўплыў на іх маюць рэспубліканскія і расійскія СМІ.

Пры пошуку інфармацыі для СМІ журналіст натыкаецца на адну з галоўных праблем сучаснай журналістыкі – праблему доступа да інфармацыі. Цэнзура СМІ на постсавецкай прасторы жыве, толькі яна перамясцілася з кантроля за публікацыямі ў кантроль над прадстаўленнем журналістам інфармацыі. Такі вывад зрабіў Расійскі Фонд абароны галоснасці па выніках апытання журналістаў. Толькі 16,2% апытаных журналістаў адказалі, што ім практычна ніколі не адмаўлялі ў атрыманні інфармацыі, 23,5% указалі, што ім часта адмаўляюць у прадастаўленні інфармацыі, астатнія – што адмаўляюць час ад

часу [2]. Як ні крыўдна гэта прызнаваць, але ў пошуку таго ці іншага факта журналіста могуць выкарыстаць як агента ўплыву, як інструмент для ўкаранення ў аудыторыю нейкай пэўнай думкі. Свядома ці несвядома журналісты становяцца праваднікамі дэзінфармацыі.

Згодна з артыкулам 33 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь кожнаму грамадзяніну гарантуецца свабода думак, перакананняў і іх свабоднае выказванне. Манапалізацыя СМІ дзяржавай і таксама цэнзура не дапускаюцца. На практыцы вынікова значэнне ў галіне рэгулявання дзейнасці СМІ маюць прававыя акты, а папраўкі да Закона «Аб друку і іншых СМІ», прынятыя ў студзені 1998 года ўстанавілі амаль што поўны кантроль дзяржавы за дзейнасцю СМІ.

На розных гістарычных этапах развіцця журналістыкі найбольш шырока паўстае праблема адказнасці аўтара за выказанае слова.Часам складана ўстанавіць, дзе праходзіць мяжа паміж свабодай выказвання і ашуканствам, злоўжываннем.

Якімі ж нормамі і стандартамі павінен карыстацца журналіст пры рабоце з крыніцамі інфармацыі? Ці існуюць яны з пункту гледжання прафесійнай журналісцкай этыкі?

1. Выкарыстоўваць для атрымання звестак выключна законныя, дастойныя дзеянні. Адступленні ад патрабаванняў права і прадпісанняў маралі (выкарыстанне «схаванай камеры», нелегальнае атрыманне дакументаў і г.д.) магчымы толькі пры абставінах, калі існуе сур'ёзная угроза грамадскаму дабрабыту ці жыццю людзей.

2. Паважаць права фізічных і юрыдычных асоб на адмову ў інфармацыі, калі яе прадстаўленне не з'яўляецца абавязкам, прадугледжаным Законам.

3. Указваць у матэрыялах крыніцы інфармацыі ва ўсіх выпадках, акрамя тых, калі ёсць падстава захоўваць іх у тайне.

4. Захоўваць прафесіянальную тайну адносна крыніцы інфармацыі, калі ёсць падставы для яе ананімнасці.

5. Захоўваць абгавораную пры атрыманні інфармацыі канфідэнцыяльнасць [3].

16 студзеня 2001 года віцебская абласная газета «Народнае слова» апублікавала невялікую заметку пад рубрыкай «Здарэнні» пра тое, як на палявой дарозе пад коламі джыпа загінула васьмігадовая дзяўчынка. Здавалася, такімі матэрыяламі СМІ звычайна папярэджваюць чытачоў: не пакідайце дзяцей на дарогах – «бестурботнасць можа прывесці да трагедыі». Аднак аўтар вышэйназванай заметкі дапусціў пэўныя памылкі пры рабоце з крыніцай інфармацыі, якая, як аказалася потым, была зацікаўлена ў тым, каб вызваліць вадзіцеля джыпа ад крымінальнай адказнасці. Без спасылкі на крыніцу, карэспандэнт даў апісанне ў дэталях таго, як развіваліся падзеі на палявой дарозе. Карэспандэнт не размаўляў ні з адным сведкам здарэння. Аўтару не ўдалося пазбегнуць пэўнай накіраванасці ў выкладанні фактаў, і гэта выклікала бурную рэакцыю з боку чытацкай аўдыторыі. Пасля публікацыі ў рэдакцыю пачалі ісці трывожныя тэлефонныя званкі ад узрушаных чытачоў, якія патрабавалі аб'ектыўнай інфармацыі па данай справе. На рэдкалегіі было прынята рашэнне накіраваць у раён уласнага карэспандэнта, які праўдзе свае журналісцкае расследаванне. 10 лютага 2001 года ў «НС» з'яўляецца карэспандэнцыя В. Сцепанішчавай «Трагедыя ў Гарадку», у якой аўтар заўважае, што калега дапусціў у папярэдней інфармацыі некарэктнасць, даверыўшыся павярхоўным звесткам работніка міліцыі. Аб здарэнні «гудзеў» увесь райцэнтр, бо нахабнік-вадзіцель ужо даўно «насіцца з вялікай хуткасцю», і калі яго не спыніць, ахвяры яшчэ будуць. Журналістка пры падрыхтоўцы матэрыялу наведала дзіцячы садок і школу, раённы аддзел унутраных спраў, райвыканкам і дом уладальніка шыкоўнага джыпа. У выніку яна паставіла ў матэрыяле пытанні, на якія павінна было адказаць следства: з якой хуткасцю ехаў джып, ці разлічыў яе з улікам слізкага дарожнага пакрыцця, вагі аўтамабіля, ускладненай траекторыі руху (прыгорак, паварот) вадзіцель. Такім чынам, матэрыял атрымаўся па-сапраўднаму

аналітычным, праўдзівым і, што не меньш важна, цікавым. З супрацоўнікам, прапанаваўшым «заказуху», рэдактару прыйшлося расстацца.

У кожнага журналіста як асобы свой творчы патэнцыял, розныя магчымасці для творчага пошуку. У большасці гэты патэнцыял залежыць ад яго ўласных ідэалаў, перакананняў, светаадчування, мэты жыцця і яго сэнсу. Самыя высокія патрэбы чалавека – патрэбы ў самасцвярджэнні і самаактуалізацыі – у журналісцкай прафесіі набываюць асабліва моцнае праяўленне, пабуджаюць журналіста не спыняцца на дасягнутым, а пераадольваць новыя вышыні. З асаблівым бачаннем свету звязаны склад розуму журналіста, яго менталітэт – касмацэнтрычны, – лічыць С.М. Вінаградава [4]. Валоданне ім сведчыць аб таленавітасці і майстэрстве. Адны журналісты здольны толькі на дысцыплінаванае выкананне заданняў кіраўніцтва рэдакцыі, выкарыстоўваючы свае веды і навыкі, працуюць з так званым самацечным матэрыялам. Другія імкнуцца заявіць аб сваім «я» і звычайна пераадольваюць шматлікія бар'еры, каб прапанаваць аўдыторыі параўнальна новую версію, новую фактуру, нечаканы паварот знаемай тэмы.

Разглядаць праблему журналісцкага пошуку немагчыма па-за праблемай свабоды духу, думкі, сумлення, свабоды друку. З прававога аспекту свабода друку дазваляе перакінуць мосцік да ўсведамлення журналістам таго, што яго прафесійная дзейнасць ажыццяўляецца ў сілавым полі свабоды і адказнасці. Ва ўмовах свабоды творчасці ўзрастае роля асабістай адказнасці за напісанае і надрукаванае. Самацэнзура журналіста абапіраецца на мараль – найважнейшы рэгулятар межаў свабоды слова. Журналісцкі пошук вядзецца ў рамках разумення гэтых паняццяў, аднак не абмяжоўваецца імі.

2 сакавіка 2001 г. рэспубліканская газета «Звязда» у падборцы «Розглас» паведаміла, што на беразе Заходняй Дзвіны здарылася аварыя: у раку вылілася 30 тысяч кубічных метраў фекальна-гаспадарчых сцекавых вод. Караценькая заметка ў два абзацы, як, дарэчы, і сама аварыя, нарабілі многа шуму, рэха ад якога дакацілася да Латвіі, якая пільна сочыць за якасцю вады ў сваей любай Даўгаве.

Журналіст газеты «Народнае слова» на працягу двух дзён высвятляла падрабязнасці ўзнікнення і ліквідацыі аварыі. Былі зроблены дзесяткі тэлефонных званкоў у камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Віцебскае прадпрыемства водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі, гарвыканкам. Высветлілася, што 30 тыс. $м^3$ забруджаных сцёкавых вод – гэта відавочнае перабольшванне. Па разліках спецыялістаў, у Заходнюю Дзвіну трапіла каля 4 тыс. $м^3$ сцёкаў з каналізацыйнага калектара. Калі матэрыял быў падрыхтаваны да друку, у рэдакцыю патэлефанавалі з аддзела па інфармаванні і рабоце з грамадскасцю аблвыканкама: просьба была далікатнай не выдаваць здарэнне за сусветны патоп. 6 сакавіка газета надрукавала матэрыял «Прарвала калектар» пад рубрыкай «Паведамляем падрабязнасці».

Аўтар прапаноўваў больш метафарычны загаловак: «Шчыліна з вялікім рэзанансам», але рэдактар палічыў, што не трэба «каламуціць ваду», калі яна і без таго каламутная. У карэспандэнцыі называецца сапраўдная прычына гэтай аварыі: «знос калектара, пракладзенага яшчэ ў 1965 годзе. На трубе з'явілася шчыліна даўжынёй 3,5 метра!». У матэрыяле выкладзены важныя і дакладныя факты. Напрыклад, сцёкавыя воды траплялі ў раку з 10 гадзін раніцы 27 лютага да 18 гадзін 1 сакавіка (больш 2 сутак), спецыялісты водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі даведаліся аб здарэнні толькі пасля таго, як адзін з жыхароў горада патэлефанаваў у гарвыканкам; і яшчэ адна акалічнасць – аналіз пробы вады з ракі на месцы аварыі паказаў перавышэнне норм гранічна дапушчальных канцэнтрацый для вадаёмаў культурна-бытавога прызначэння па азоту аманійнаму ў 1,8 раза, нафтапрадуктам у – 5,5 раза. Аднак пробы рачной вады ў раёне Наваполацка

шкодных адхіленняў не выявілі. Так прафесійны і сумленны падыход журналіста да пошуку інфармацыі даў вычарпальныя адказы на многія пытанні па данай з'яве.

Праблема захавання пазіцыі нейтральнасці журналіста пад час збору і падрыхтоўкі матэрыялу найбольш актуальна ў сучасным кантэксце. Адзін са шляхоў, які вядзе да ўзмацнення пазіцыі нейтральнасці ў падачы інфармацыі, звязаны з удасканальваннем навыкаў пазнаваць свет у працэсе творчай дзейнасці. Пазнавальны працэс для журналіста ўяўляе сабой рашэнне задач трох тыпаў: эмпірычныя (прадугледжваюць устанаўленне фактаў), тэарэтычныя (накіраваныя на выяўленне ўнутраных і знешніх сувязей паміж фактамі), арганізацыйна-практычныя (накіраваныя на аптымальную арганізацыю хода работы) [4, с. 67]. З першымі двума тыпамі мы пазнаёміліся пры разглядзе папярэдняга матэрыялу аб здарэнні на калектары. На трэцяй пазіцыі мы больш падрабязна спыніліся, разглядаючы сітуацыю з публікацыяй матэрыялу «Трагедыя ў Гарадку». Ва ўсіх гэтых публікацыях першакрыніцай інфармацыі для журналіста з'яўляўся чалавек як яго суразмоўца, як інфарматар. Таму спынімся на некаторых псіхалагічных аспектах развіцця міжасабовых узаемадзеянняў. Псіхолагі вызначаюць пяць фаз у кантакце паміж людзьмі: матывацыя, уваход у кантакт, дзеянне, выхад з кантакту, аналіз. Для журналіста выпадковая памылка на любым этапе міжасабовых узаемадзеянняў можа каштаваць поспеху або няўдачы ў яго пэўнай рабоце. Трэба ўсвядоміць, што журналіст часцей за ўсё працуе ў нестандартных умовах, і адаптацыя да гэтых умоў праходзіць для кожнага індывідуальна. Спачатку ён пераадольвае псіхалагічны бар'ер перад новай устаноўкай, новай тэмай, праблемай, сустрэчай з незнаёмым чалавекам. Сацыяльныя псіхолагі вылучаюць паняцце псіхалагічнай гатоўнасці як максімальнай уключанасці творчых сіл і здольнасцей суб'екта ў дзейнасць. Тэхналогія прафесійных паводзін журналіста дазваляе пераадолець бар'ер уласнага супраціўлення і спланаваць паслядоўную «гульню» з крыніцай інфармацыі. Вылучаюцца некалькі суб'ектыўных фактараў, якія аказваюць уплыў на змястоўны бок інфармацыі пры фарміраванні адказаў на вашыя пытанні [5]:

1. Прафесійная кампетэнтнасць крыніцы інфармацыі.
2. Эрудыцыя крыніцы інфармацыі.
3. Накіраванасць крыніцы інфармацыі, яна вылучаецца ў асабістых магчымасцях крыніцы, у ступені прапрацаванасці звестак.
4. Крытычнасць інтэлекта (аказвае ўплыў на дакладнасць інфармацыі).
5. Каштоўнасныя арыентацыі і сацыяльныя ўстаноўкі крыніцы інфармацыі.
6. Асабістыя планы крыніцы інфармацыі.

Вялікую ролю ва ўзаемадзеянні журналіста і крыніцы інфармацыі маюць зносіны сілы і залежнасці. Кожны тып зносін разумеецца як зносіны, якія маюць характар як супрацоўніцтва, так і канкурэнцыі адначасова, сцвярджае У. Мастэнбрук у артыкуле «Арганізацыйныя зносіны» [5]. ...Заўсёды існуе некаторая напружанасць паміж жаданнем пэўнай аўтаноміі і наяўнасцю ўзаемазалежнасці.

Такім чынам, журналіст часта спыняецца перад дылемай: у дыялогу весьці сабе лідэрам ці быць раўнапраўным партнерам. Аўтар кнігі «ТБ – эвалюцыя нецярпімасці» С. Муратаў дае свае парады інтэрв'юэрам: інтэрв'юэра нельга лічыць прафесіяналам, калі ён вядзе размову так, што эмоцыі зыходзяць не ад суразмоўцы, а ад яго самога [6].

Згодна тэорыі чаканняў, журналіст можа атрымаць ці не атрымаць чакаемага эфекту ад свайго пошуку праз суразмоўцу як крыніцу інфармацыі. У выніку ён падключае іншыя сродкі для дасягнення мэты.

Для любой творчай арганізацыі характэрны такія рысы: патрабаванне выпрацоўваць новыя рашэнні, успрымальнасць да новых ідэй, цярпімасць

да «дзівацтваў», свабода выбіраць праблемы і змяняць накірункі даследаванняў, стымулы для творчасці, называецца таксама цярпімасць у адносінах да «іншадумцаў». Журналісцкая дзейнасць заўсёды трымаецца канкрэтыкі, прыватнага, а значыць, тут вырашаецца асаблівая задача прымянення ўсеагульных ведаў да прыватных выпадкаў. Гэтую задачу вырашае «практычны розум», які накіраваны на дзейнасць і таму павінен мець абодва віды ведаў, агульных і прыватных. Журналіст павінен быць вытанчаным назіральнікам, каб умець выхапіць тыя асобныя дэталі, якія дапамогуць яму потым стварыць пэўную і поўную карціну зрэзу жыцця.

Звернемся да класічнага прыкладу – нарысаў Васіля Пяскова. «Комсомольская правда» ад 17 жніўня 2001 года змяшчае чарговае «акно ў прыроду» пад назвай «Слаўнае імя – Гржымек». У аснове матыву напісання гэтага цудоўнага нарыса – турыстычная паездка аўтара ў саваны Усходняй Афрыкі. Нарысіст пабываў на магіле маладога Гржымека. Сын знакамітага абаронцы дзікіх жывелін загінуў тут, калі разам з бацькам здымаў фільм аб прыродзе Афрыкі. Аднак блакноты вопытнага майстра слова захавалі і запісы, зробленыя пад час сустрэч Пяскова і Гржымека як у Расіі, так і ў Германіі, радзіме прафесара. Падчас іх сумесных вандровак па падмаскоўных лясах, па Волзе В. Пяскоў старанна занатоўваў многія дэталі і словы, выказаныя біёлагам. У кантэксце нарыса побач з пафаснасцю публіцыста, які ўключыў у свае радкі і элементы рэпартажу, замалёўкі, артыкула, знайшоў месца і дыялог паміж двума прафесіяналамі. Журналіст задаў шэсць пытанняў прафесару: аб славе і вядомасці, аб радасці і горы ў жыцці, аб перамозе і паражэнні. Здавалася б, банальныя пытанні да славутасці, але з вуснаў сапраўднага Гуманіста мы быццам пачулі вельмі трапныя і змястоўныя адказы.

Жыццёвы і прафесійны вопыт часам падказвае журналісту найбольш трапнае выйсце на той ці іншы факт, а менавіта вакол факта і канцэнтруе сваю дзейнасць сучасны друк. Вялікую ролю ў практыкі журналіста адыгрывае яшчэ і інтуіцыя. Разважаючы аб суб'ектыўным баку справы, заўважым, што чалавеку не падуладна ўсведамляць, як працуе механізм яго свядомасці, як узнікаюць і прыходзяць патрэбныя думкі і вобразы. «Калі б пішучы стаў назіраць, як складаецца працэс пошуку, як з'яўляюцца якія-небудзь думкі, вобразы, ён па сутнасці не змог бы пісаць» [7]. Паводле Г. Лазуцінай, пры падрыхтоўцы журналісцкага матэрыялу чалавек вырашае два блокі задач. Першы звязаны з асваеннем рэчаіснасці і разварочваецца ва ўсвядомленую, мэтанакіраваную пазнавальную дзейнасць. Яна стварае пачатковую стадыю творчага акта, у ходзе якога выконваюцца адпаведныя тэхналагічныя аперацыі (часцей пабудаваныя на зносінах), выпрацоўваецца канцэпцыя жыццёвай сітуацыі, якая стала для журналіста прадметам спецыяльнага вывучэння. Другі блок задач звязаны з фарміраваннем і ўвасабленнем задумы канкрэтнага матэрыялу на аснове выпрацаванай канцэпцыі, г.з. з прад'яўленнем інфармацыі. У адпаведнасці са стадыямі творчага акта існуюць дзве групы метадаў: метады пазнавальнай дзейнасці і метады прад'яўлення інфармацыі. Першая група складаецца з метадаў атрымання звестак і метадаў разумення сутнасці. Другая аб'ядноўвае ў сабе метады прад'яўлення фактаў і метады прад'яўлення матэрыялу культуры. Кожны з метадаў уяўляе сабой сукупнасць навукова абгрунтаваных дзеянняў, накіраваных на рашэнне пэўнай задачы [3, с. 60-61].

У віцебскай абласной газеце «Народнае слова» 5 чэрвеня 2001 года з'явіўся цікавы публіцыстычны рэпартаж А.Чуйко «Проста я працавала кандуктарам». Ён прыцягвае ўвагу, па-перш, таму, што выпадкі, калі журналіст змяняе прафесію, зараз у практыцы вельмі рэдкія. На жаль, забываецца гэты прываблівы і эфектыўны метад спасціжэння сутнасці той ці іншай справы.

Таму журналістка вельмі трапна паступіла, калі прапанавала апынуцца ў «скуры» кантралёра. Свае назіранні, пачуцці, атрыманыя пад час работы кандуктарам у гарадскім грамадскім транспарце, яна потым маляўніча выклала ў тэксце. «У школе я вучылася на малодшага прадаўца, і гэта прыгадзілася: рэшту давала правільна, засоўваючы тысячныя купюры ў глыбіню сваей кандуктарскай сумкі – раптам украдуць!...Па нявопытнасці многа праблем узнікала ў мяне з праверкай пасведчанняў асоб, якія маюць права на бясплатны праезд. Быў выпадак, калі я ад страху не звярнула ўвагі на надпіс «май 01» і ўсумнілася ў сапраўднасці гэтага праезднога дакумента. На маё «у вас ліпавы праяздны», пасажыр зло заўважыў кандуктару, якая паспяшыла мне на дапамогу: «Ну, ў вас і жартачкі!»».

«Праз пару гадзін маей працы я перастала ўсміхацца пасажырам, праз раз выгаворвала чароўнае слова «калі ласка», не рэагавала на жарты і заўвагі. Усіх пасажыраў умоўна падзяліла на нармальных, нахабных і п'яных». У журналіста, які працуе ў такіх умовах, аўтаматычна спрацоўвае псіхалагічная ўстаноўка на дасягненне пастаўленай мэты – у дадзеным выпадку на збор фактычнага і назіральнага матэрыялу для блакнота. Аўтар не абмежавалася толькі ўласнай работай кандуктарам на аўтобусным маршруце, каб пашырыць свой кругагляд па данай тэме, яна зазірнула і ў бухгалтэрыю, каб даведацца пра сярэднюю зарплату кандуктара, размаўляла з вопытнымі работнікамі гэтага цэха, са спецыялістамі кантрольна-рэвізіённай службы аўтапарка. Урэшце атрымалася амаль поўная карціна прафесіі.

Сення журналіст без трывалай грамадзянскай пазіцыіператвараецца ў звычайнага інфарматара, які не знаёмы з паняццямі аб прафесійным абавязку, сумленні, адказнасці. Усведамленне свайго прызначэння ўстанавіць ісціну з'яўляецца рашаючым на этапах журналісцкага пошуку.

Віцебская абласная газета «Віцебскі рабочы» надрукавала артыкул М. Прыгожага «Свінячая справа», або Чаму ушацкая Феміда не верыць егерам» – 2 сакавіка 2001 года. Падставай для журналісцкага выступлення стаў разгляд адной грамадзянскай справы ў судзе, на паседжанні прысутнічаў і аўтар артыкула. Кароценькая фабула справы такая. Дырэктар паляўнічай гаспадаркі пад час адной праверкі выйшаў на след бракан'ераў, якіх прызнаў у твар, але, як гавораць, не схапіў за руку. Узброеныя людзі паспелі ўцячы на аўтамашыне, пакінуўшы ў лесе застрэленую свінаматку. Да таго ж, сярод бракан'ераў аказаліся і прадстаўнічыя людзі ў мундзірах. Менавіта апошнія абставіны паўплывалі на тое, што міліцыя аператыўна не адрэагавала на незаконную здабычу жывеліны. У выніку і суд не падтрымаў ушчуванні дырэктара – змагара з бракан'ерамі.

Журналіст паспрабаваў перадаць рэаліі міжасабовых адносін, якія існуюць паміж службовымі асобамі ў райцэнтры. Пагрозы, шантаж, незацікаўленасць у абароне прыродных багаццяў – вось з чым сутыкнуўся карэспандэнт у творчай камандзіроўцы. Варта заўважыць, журналіст не пайшоў на повадзе чытацкай аўдыторыі, якая мусіла прачытаць чарговы дэтэктыў з ушацкіх лясоў, а дасканала вывучаў кожны дакумент, які мог мець дачыненне да гэтай скандальнай гісторыі. І кожны дакумент стаў у яго руках аргументам.

У публіцыстычных тэкстах факт атрымлівае тое ці іншае гучанне ў залежнасці ад пазіцыі аўтара, ад таго, як ён адносіцца да падзеі, сітуацыі, якія прад'яўляе чытачу. Парадокс заключаецца адначасова і ў тым, што сучасныя падыходы да журналісцкай работы патрабуюць максімальнай нейтральнасці.

Правядзем дзве паралелі: як у дзвюх розных газетах у адзін і той жа час быў выкарыстаны аднолькавы фактычны матэрыял. 27 красавіка 2001 года «Беларуская дзелавая газета» змяшчае артыкул «Храм на касцях» пад рубрыкай «Спадчына». На дзень пазней абласная газета «Народнае слова» прапануе чытачу сваю «загадку» у рубрыцы «Погляд» – «Невядомыя

захаванні на Успенскай горцы». Галоўны факт, які пранізвае абодвы тэксты: у Віцебску пачаліся работы па аднаўленню Свята-Успенскага сабору, будаўнікі натыкнуліся на масавае пахаванне людзей. На гэтым месцы ўжо працаваў асобны спецыяльны пошуковы батальён, але работа не закончана. Існуе некалькі версій наконт астанкаў. Адна з верагодных – расстрэлы НКУС. У карэспандэнцыі абласной газеты аўтар падводзіць матэрыял да вываду: няўжо тайна Успенскай гары так і не будзе раскрыта? На жаль, у матэрыяле не названы ні службовыя асобы, ні ўстановы, якія прымаюць адпаведныя рашэнні не на карысць захавання культурнай спадчыны і ўстанаўлення гістарычнай праўды. Больш пераканаўчым і пафасным выглядае артыкул у «Беларускай дзелавой газеце». На фоне экскурса ў гісторыю ўзнікнення храма паўстае драматычная карціна міжканфесійных спрэчак у мінулых стагоддзях. Спрэчкі вакол Успенскай горкі не заціхаюць і зараз. Напрыклад, паміж архітэктарамі і рэстаўратарамі. Адны хацелі б бачыць храм у яго першапачатковым варыянце, другія аддаюць перавагу больш позняму, праваслаўнаму, абліччу сабора. А тут яшчэ – астанкі соцен людзей... Менавіта, апошнія абставіны ніяк не задавальняюць ні ўлады, якія абяцалі пабудаваць храм за два гады, ні праваслаўных святароў. Можна сказаць, што аўтар артыкула ў «БДГ» выкарыстала больш эфектыўныя сродкі журналісцкага пошуку, і гэта зрабіла публікацыю значна глыбейшай і актуальнай.

Вынікі журналісцкага пошуку залежаць ад актыўнасці творчай асобы журналіста, ступені яго прафесійнай падрыхтоўкі, жыццёвага вопыту і грамадзянскай сталасці. Немалаважнае значэнне маюць сацыяльна-палітычныя ўмовы, якія існуюць у грамадстве, маральна-псіхалагічны клімат у рэдакцыі. Рэгіянальныя СМІ працуюць у лакальнай інфармацыйнай прасторы. Выхад на адкрыты доступ да інфармацыі магчымы ва ўмовах глабалізацыі інфармацыйных сетак і інфармацыйных патокаў. Працэсы журналісцкага пошуку запавольваюцца па прычынах няўпэўненасці журналістаў у патрэбе ўкаранення новых ідэй, матэрыяльнай стрыманасці, прафесійнай нясталасці, самацэнзуры, марудных тэмпах камп'ютарызацыі СМІ, у тым ліку немагчымасці выхаду ў Інтэрнэт. Разам з тым трэба прызнаць, што рэгіянальныя СМІ працуюць ва ўмовах канкурэнцыі, і гэта вымушае іх выпрацоўваць новыя тэхналогіі журналісцкага пошуку. Свабода думкі і друку дае творчай асобе больш магчымасцей для развіцця свайго таленту. Аднак пры наяўнасці пэўнай свабоды ўзрастае роля адказнасці журналіста за напісанае і надрукаванае. У публіцыстычных тэкстах факт атрымлівае тое ці іншае гучанне ў залежнасці ад пазіцыі аўтара. Сучасныя падыходы да вывучэння рэальнасці патрабуюць ад журналіста нейтральнай пазіцыі.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Власть, зеркало или служанка? Энциклопедия жизни современной российской журналистики.*** Т.2. С.176.
2. ***Журналист в поисках информации.*** М., 2000. С. 6.
3. ***Лазутина Г.В.*** Профессиональная этика журналиста. М., 2000. С.164.
4. ***Основы творческой деятельности журналиста.*** СПб, 2000. С. 56.
5. ***Организационная психология.*** СПб, 2000. С. 452.
6. ***Муратов С.*** ТВ – эволюция нетерпимости. М., 2001. С. 165.
7. ***Черепахов М.С.*** Таинство мастерства публициста. М., 1984. С. 8.



*S U M M A R Y*

*The paper covers some aspects of the creative work of the journalist. The main focus is on the search of information by journalists of regional newspapers.*



*Поступила в редакцию 12.09.2001*